# Да юбілею прафесара Уладзіміра Конана

Унёсак навукоўцы ў развіццё навуковай галіны залежыць перадусім ад маштаба асобы. Калі інтэлект і душа пакрываюць вялікія абшары, ёсць падставы для прасоўвання наперад цалкам усёй сферы навуковых інтарэсаў, уводзення нацыянальнай навукі ў сусветны кантэкст. Беларускі філосаф, эстэтык, культуролаг, публіцыст, міфолаг Уладзімір Конан заклаў асновы беларускай культуралогіі яшчэ да часоў адасаблення культуралогіі ў асобную навуку на постсавецкай прасторы. Для аматараў каранёвай культуры Беларусі ён цікавы як даследчык тыпалогіі і архетыпаў беларускага фальклору, асаблівасцей яго еўрапейскага кантэксту. Адданым грамадскай дзейнасці ён вядомы як супрацоўнік навукова-гуманітарнага цэнтру імя Францыска Скарыны.

Па аналогіі з выразам «Бах апярэдзіў усіх еўрапейскіх кампазітараў у галіне музычнай гармоніі да сярэдзіны XIX стагоддзя», можна сцвярджаць, што выданне 1974 года «Нарысы з гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі» апярэдзіла напрацоўкі гуманітарыяў-беларусістаў (гісторыкаў, культуролагаў, мастацтвазнаўцаў) да пачатку XXI стагоддзя. Толькі зараз даследчыкі пачынаюць пакрыху выходзіць за храналагічныя (IX–XX стагоддзі) і жанравыя (архітэктура, жывапіс, музыка, тэатр, літаратура) вехі ў беларусістыцы, якія акрэсліў Уладзімір Конан ў «Нарысах...» разам з сааўтарам Энгельсам Дарашэвічам. Прычым акрэсліў вельмі рэльефна, даходліва і кампактна, што зрабіла выданне найзапатрабаваным бестселерам беларусістаў – даследчыкаў гарадской, еўрапейскі арыентаванай плыні нацыянальнай культуры.

Асабістыя якасці Уладзіміра Міхайлавіча заўсёды вымагаюць пачэснага эпітэту «шасцідзесятнік». Больш дэмакратычнага, прынцыповага, чулага і добразычлівага чалавека цяжка знайсці. Асабліва шмат ад яго атрымліваюць тыя, хто сапраўды варты дапамогі – маладыя навукоўцы, спецыялісты-практыкі, якія крочаць па шляху інавацый і эксперыментаў. Важкае док-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тарскае слова Конана на абароне дысертацый значна павялічыла колькасць адданых даследчай працы людзей з дыпломам кандыдата навук. Нягледзячы на занятасць, доктар філасофіі Конан неаднаразова ўдзельнічаў у імпрэзах флагманскага праекта па этнакультурным выхаванні на Беларусі – фестываля фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі «Берагіня» на Усходнім Палессі. Згодна з памкненнямі душы, ён часцяком апынаўся там, дзе найбольш патрэбна падтрымка, дзе сутыкаюцца патрэбы народа як этнічнай адзінкі, біясацыяльнай еднасці з вузкакарпаратыўнімі інтарэсамі асобных псеўданавуковых кланаў ці асобных несумленных адміністратараў.

Дакладны маштаб асобы гэтага беларуса з кімерыйскім прозвішчам вымерыць час і ўдзячныя новыя генерацыі нашага народа. Удзячныя за святло высока ўзнятай ім «паходні ведаў», якой быў асветлены тысячагадовы гістарычны і культурны шлях беларусаў. Водбліскі гэтай паходні траплялі і на больш аддаленыя ў часе і прасторы кропкі, але іх асвятленне – задача будучыні, у якой Уладзімір Конан вымавіць сваё слова ў сугучны са словамі тых, каго ён натхніў, заахвоціў, накіраваў на шлях служэння ведам, на шлях служэння адназу з найпрацавітых, сціплых і па-мастацку адораных ўсходнеўрапейскіх народаў – народу Беларусі.

*Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,*
*кандыдат культуралогіі, дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУ культуры і мастацтваў*
*30 верасня 2008 г.*

*Першая публікацыя*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ